Простая мова

# ЧАЛАВЕКАМ МАЛА НАРАДЗІЦЦА

## Ім яшчэ трэба стаць

***І зноў што бачу.***
***Нядзеля, надвячорак, спальны раён сталіцы... Там стараватыя дамы, але ж новыя лаўкі ля пад'ездаў.***
***На адной — старэнькая бабуля, мусіць, заўсёдніца, бо ўсе з ёй вітаюцца, а нейкая жанчына дык нават падсаджваецца, заводзіць размову — досыць гучную (бабуля, падобна, недачувае?). А голас звініць — далятае да трэцяга паверха, «расчыняе» акно ў нейчай кухні.***
***— Шура, табе кабачкоў даць? — нясецца адтуль.***
***— Не, дзякуй... У нас свае ёсць, — адгукаецца бабуліна суразмоўца.***
***— А ў каго няма, ты не ведаеш?***
***— Не...***
***Акно зачыняецца.***
***У вяскоўцаў і дачнікаў дзве бяды: нешта НЕ ўрадзіла і... урадзіла. І адно не мёд і другое не рэдзька.***

### ШТО ТАКОЕ ДОБРА

Вечар, паўпусты тралейбус. На пярэднім сядзенні двое — мужчына і жанчына, магчыма, сужэнцы, бо яна так даверліва прытулілася да пляча... І гаворыць-гаворыць-гаворыць...

Міжволі слухаем: як яна ў абед матнулася ў краму, як убачыла там прыгожы касцюмчык, потым да яго яшчэ блузачку (расказ пра тканіну, колер, фасон, цану расцягнуўся на пяць прыпынкаў), што спадніцу — нават прымерала: і так яна добра «села»... Але ж не купіла — падумала...

— Што? Не будзе куды павесіць? — ціха пытае муж.

І тым самым нагадвае запіс «на сцяне»: «Учора з сынам рабіў урокі. Цяжэй — толькі з жонкай хадзіць па крамах».

### БЫЛО Б ЖАДАННЕ

З дыялогаў у дзіцячым садку:

— Вой, Мая Іванаўна, у вас такія пазногці... Вострыя, доўгія...

— Табе падабаюцца? — удакладняе выхавацелька ў Вовачкі.

— Ну яшчэ б! З такімі на дрэва добра залазіць.

Гэта быў анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Хлопец жаніцца надумаў, першы раз нявесту дадому прывёў. Бацькі з той прыемнай нагоды стол накрылі: частавалі дзяўчыну, распытвалі пра вучобу, сям'ю.

Тая расказвала і адказвала, хваліла стравы, парывалася дапамагчы гаспадыні... Спадабалася, карацей, і будучай свякрові са свёкрам, і юнай залоўцы, і кошцы...

Адна бабуля засмучонай была: перажывала, баялася, што бедным будзе яе ўнук, што не атрымаецца з гэтай дзяўчыны талковай жонкі...

Чаму?

Ды вы ж бачылі, маўляў, якія ручкі ў яе? А якія пазногці? Хіба ж яна, з вось такімі, нешта памые ды зварыць, хіба потым (даслоўна) «дзіцяці с. падатрэ»?

...Дзіўна, але факт: пры жаданні сённяшнія жанчыны ўсё гэта робяць, прычым — гуляючы: без «наступстваў» для пяшчотнай дзіцячай пятай кропачкі і... пазногцяў.

### ПАСЕЕШ ПРЫВЫЧКУ — ПАЖНЕШ ХАРАКТАР...

Горад. Універмаг — паўпусты, здаецца? Аднак у «Мужчынскім абутку» хтосьці тармозіць — каля касы — чарга.

Перад намі — дзве пажылыя жанчыны, перад імі — маладзён у навушніках, са шкарпэткамі.

— Во, адну пару купляе, — заўважае старэйшая з кабет. — Дзівак...

— Ну чаму гэта «дзівак»? — не згаджаецца маладзейшая. — Можа, яму болей не трэба?

— Як гэта «не трэба»?.. Ды яшчэ і як! Адна шкарпэтка — ты ж ведаеш — хутка пратопчацца. Цыраваць яе моды няма. Значыць, цэлую следам выкіне — пойдзе ў магазін па новыя. А купіў бы пяць пар аднолькавых і клопату не меў... Мае мужчыны ўсе так рабілі — і муж, і сын, і абодвух зяцёў прывучыла...

Шкада, што хлопец быў у навушніках і размовы гэтай не чуў. Мо таксама прывык бы?

### РОДНЫЯ? РОЗНЫЯ...

У сям'і было двое дзетак — хлопчык і... хлопчык.

Ён, малодшанькі, у пяць гадоў захварэў на анкалогію і памёр.

Бацькі — абодва медыкі — як не звар'яцелі!

І, можа, сапраўды, каб не крануцца розумам, нарадзілі дачушку — прыгажуньку, а ўжо ж пястушку... Для яе было ў доме ўсё: варта пачуць такое мілае «хачу-хачу!» — і на, дзіцятка, трымай — найлепшыя прысмакі, цацкі, строі. Любы капрыз...

Старэйшае дзіця бацькі, можна сказаць, не бачылі: яно існавала само па сабе ды як нянька для малодшага.

...Але ж гады прайшлі, і дзеці павырасталі: абое атрымалі адукацыю (дачка — за грошы), а сын — яшчэ і добрую, грашовую работу.

Менавіта ён дапамог бацькам «вылезці з хрушчоўкі» — пабудаваць і абставіць новую кватэру. Менавіта ён са сваёй сям'ёй да апошняга даглядаў састарэлых.

...Яны неяк рана пайшлі: абое, можна сказаць, раптоўна і адзін за адным. Тэстаменту, карацей, не пакінулі. Ды і навошта, калі ўсё было відавочным, само сабой зразумелым — і для іх, і для сына, і для... дачкі, якая была проста ўпэўнена, што ўся маёмасць — рухомая і нерухомая — павінна дастацца ёй.

Хіба не?!



Больш за ўсіх дастаюць людзей акушэры.

Фота з адкрытых крыніц.

«Абвалялася ў капрыз». З братам не бачацца і не размаўляюць.

За кватэру, дзе ніхто не жыве, плаціць ён.

...Янка Брыль некалі пісаў пра двух братоў-вяскоўцаў, якія акурат таксама гадамі (ці нават дзесяцігоддзямі) дзялілі бацькоўскую хату. І ўрэшце — ПАдзялілі так: распілавалі — уздоўж, паміж двума вокнамі.

Адзін з братоў разабраў сваю палавіну на дровы, другі — забіў дошкамі. І яна, вось такая, яшчэ доўга стаяла — помнікам дурнаце.

...Сёння такіх помнікаў, мусіць, безліч — і ў гарадах, і ў вёсках?

(Нехта з мудрых параду пакінуў: ніколі не гаварыць, што ведаеш чалавека, пакуль не дзяліў з ім спадчыну.)

### ДА ЛЯМПАЧКІ

...Запальнічку для газавай пліты купляеш рэдка: паспрабуй — разбярыся, якая розніца паміж вунь той і гэтай.

Трэба спытаць у прадаўцоў.

Яны ўдвух (да слова, усё часцей хлопцы, маладыя мужчыны) досыць падрабязна тлумачаць... І, як высвятляецца, не толькі нам: побач нейкі дзядзька вушы навастрыў — разам з намі разглядае тавар, слухае і пры гэтым нават не маўчыць: хваліцца, «злавіўшы» паўзу, што таксама ведае беларускую мову, што яна — прыгожая і багатая, што на ёй трэба размаўляць — і начальству, і нам усім...

— А то ж, — даслоўна, — анідзе яе не пачуеш.

Трэба было сказаць чалавеку, што ён трохі памыляецца, бо людзі такія і былі, і ёсць... Але ж часу — вобмаль: толькі на тое, каб разлічыцца за абнову для кухні, каб падзякаваць прадаўцам. І, ужо сыходзячы, пачуць за спінай дзядзькава:

— Ребята, мне, пожалуйста, четыре лампочки...

### «ЧАЛАВЕКАМ МАЛА НАРАДЗІЦЦА...»

Сіноптыкі падвялі — не сказалі пра дождж. Ды і скуль, здавалася, яму брацца: на небе ніводнай хмурынкі не было — калі ў трамвай садзіліся, а сабраліся выходзіць — залева, можна сказаць!

А следам — нялёгкі выбар: перачакаць гэтую навалу (парасон дома) і спазніцца на прыём да доктара? Альбо НЕ чакаць — прыйсці своечасова, але «прыгажунямі» — якіх свет не бачыў.

Мы выбіраем першае: гэта значыць, дабягаем да прыпынку, разам з іншымі займаем месца пад стрэшкай, пакорліва стаім — глядзім на дождж, на машыны, што праязджаюць, а хвілін праз 20, можна сказаць, праплываюць міма.

Што цікава, нехта з кіроўцаў на пад'ездзе да прыпынку, дзе стоўпіўся народ, скідвае хуткасць, каб, бронь божа, нікога не абліць вадой з-пад колаў, а нехта...

— Во якога прыдурка пранесла! — абураецца мужчына, тулячы да сябе малую ў бялюткіх туфліках, гольфіках і спадніцы.

— Яшчэ двух, дзеда! — адгукаецца дзяўчынка, пасля чаго ці не ўвесь «натоўп» пад застрэшкам знаходзіць сабе нясумны занятак — падлічваць прыдуркаў і разумных.

Іх, апошніх, па нашых прыкідках, па той вуліцы праязджала больш.

А зрэшты — не факт: можа, іх дурату вада «збівала»?

...З Асадава дарэчнае тут:

*Плохой ли,*
*хорошей рождается птица,*
*Ей всё равно суждено летать.*
*С человеком так же не случится,*
*Человеком мало родиться.*
*Им ещё надо стать.*

### УСЮДЫ ЛЮДЗІ...

Што новага на дачы, у Наташы лепей не пытаць, бо ў яе, па-першае, не дача, а дом за горадам — з усімі выгодамі, з гаражамі, склепам, садам-агародам... А цяпер — яшчэ і суседам.

Ён, казала, нядаўна з'явіўся — малады, здаровы... Яна рада была: думала, ну нарэшце парадак навядзе, а то ж трава на ўчастку — можна сказаць, у пояс...

За суседам і сапраўды справа не стала: на свой першы пакос ён выйшаў у... шэсць гадзін раніцы, з трымерам (гэта касілка такая... Раве — гучней, чым трактар).

Не даў, карацей, паспаць — у законны выхадны.

Наташа, як прызнавалася, хацела выйсці і вельмі шмат што сказаць... Але ж неяк сцярпела — на першы раз...

Хіба што потым, пад абед, убачыўшы мужчыну на вуліцы, досыць далікатна заўважыла, што рабіць так — нядобра.

— Нядобра, — здзівіўся той. — Гэта ж каму?.. Вам? Затое мне — добра! Раніцай, па халадку, яно ж са́ма касіць! Потым горача будзе.

— Але ж побач, — паспрабавала давесці суседка, — людзі: недзе старыя, недзе малыя... Ім жа адпачываць ноччу трэба, а не касу вашу слухаць...

— Я вас пачуў, — абнадзеіў сусед і сваю другую касьбу распачаў... а пятай гадзіне раніцы.

...Цяпер Наташа ведае, што добры дзень на лецішчы — гэта калі свеціць сонца, спяваюць птушкі, цвітуць кветкі, а ў суседа (30 сотак зямлі) зламаўся трымер.

Гэта — па-першае. Па-другое, модная цяпер фраза: «я вас пачуў» азначае хутчэй не згоду, а нешта сярэдняе паміж ёй і такім жа «модным» «пайшла ты...»

Па-трэцяе, у горадзе міліцыя, у вёсцы ўчастковы без работы ніколі не будуць.

Дзіўная ўсё ж такі наша мова: сінонімы быццам, а якая велізарная розніца паміж людзьмі — блізкімі і недалёкімі.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж з упадабанага: сляпы чалавек аддаў бы ўсё, каб убачыць, як заходзіць сонца, глухі — каб пачуць музыку, нямы — каб услых прачытаць малітву. А колькі паралізаваных людзей хацелі б зрабіць хоць некалькі рухаў...***

***Падумайце пра гэта ў наступны раз, калі падасца, што вы пакрыўджаны лёсам.***